# Гродна: 1941 год

*Крыніца друкавання*: Жабрун, Я. Гродна: 1941 год / Яўген Жабрун // Гродзенская праўда. – 2001. – 19 мая (№ 75-76). – С. 2.

*Якім быў наш горад у 1941 годзе? Успомнім пра яго людзей, справы планы. Дапамогуць нам зрабіць гэта архіўныя і іншыя крыніцы.*

Пасля ўз'яднання восенню 1939 года Заходняй Беларусі з БССР гродзенцы былі заняты мірнай працай. Горад будаваўся, рэканструяваўся і пашыраўся. Праўда, яго тэрыторыя была ў 1941 годзе амаль на палову менш сучаснай. Пражывала тады 70 тысяч жыхароў. Налічвалася каля 60 вуліц і плошчаў.

Сацыяльна-эканамічным развіццём горада кіравалі гарком КП(б)Б, першым сакратаром якога быў Іван Барысавіч Пазнякоў, гарадскі Савет дэпутатаў працоўных і яго выканком (старшыня Пётр Іванавіч Ратайка). Гродна ў той час з’яўляўся адным з буйнейшых прамысловых цэнтраў Заходняй Беларусі.

Было пакончана з беспрацоўем. У пачатку 1941 года газета «Свабодная Беларусь», якая выходзіла ў Гродна, пастаянна паведамляла аб патрэбных для прадпрыемстваў спецыяльнасцях.

План першага квартала 1941 года прамысловасць горада, якая налічвала больш за 30 прадпрыемстваў, выканала на 107 працэнтаў. Расла прадукцыйнасць працы. Лепшымі былі паказчыкі на гарбарным заводзе № 4, абутковай фабрыцы, фанерным заводзе, прамысловым камбінаце. Паспяховым чакалася і выкананне плана другога квартала. Разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва ў прамысловасці і на транспарце. Шырокую падтрымку атрымаў стаханаўскі рух. Дарэчы, 2 чэрвеня 1940 года на фанерным заводзе прайшоў першы гарадскі злёт стаханаўцаў.

Многа было зроблена і ў іншых галінах народнай гаспадаркі. Возьмем, напрыклад, народную адукацыю. У 1940-1941 навучальным годзе ў Гродна ў 2 пачатковых, 10 няпоўных сярэдніх і 9 сярэдніх школах праходзілі навучанне 11584 школьнікі. Паколькі каля палавіны насельніцтва з’ўлялася непісьменным або малапісьменным, па рашэнню ўлад горада былі створаны 27 школ для дарослых, у якіх вучылася каля 2 тысяч чалавек. Колькасць настаўнікаў па параўнанню з 1939 годам павялічылася з 220 да 360. У Гродна

працавалі настаўніцкі інстытут, будаўнічы, настаўніцкі і фізкультурны тэхнікумы, 5 дзіцячых дамоў і 9 дзіцячых садкоў.

Значныя змены адбыліся ў 1939-1941гг. у ахове здароўя гараджан. Лячэнне стала бясплатным для ўсіх. У Гродна дзейнічалі 3 паліклінікі, 10 медпунктаў, 7 бальніц, 8 аптэк, 2 дыспансеры, хуткая медыцынская дапамога, 2 жаночыя кансультацыі, дом дзіцяці, малочная кухня, станцыя пералівання крыві, фельчарска-акушэрская школа. На ахову здароўя гараджан у 1940 годзе было асігнавана 4400 тысяч рублёў.

Напярэдадні вайны, 18-19 чэрвеня 1941 года, прайшоў VIII пленум гаркома партыі, на якім разглядаліся пытанні жыллёва-камунальнага будаўніцтва ў горадзе. Працягласць водаправодных сетак тады складала каля 40 км, магутнасць водазабора - 10 тыс. куб.м у суткі. У горадзе было 4 гасцініцы на 186 месцаў, лазня на 152 месцы, радыёвузел і 7 аддзяленняў сувязі, тэлефонная станцыя на 800 нумароў. Сетка гандлю і грамадскага харчавання складалася з 8 рэстаранаў, 23 сталовых і 153 магазінаў.

У Гродна і на яго ўскраінах вялося будаўніцтва не толькі жылля, але і бомбасховішчаў, розных абарончых збудаванняў. Актыўна ўмацоўвалася дзяржаўная мяжа. 3 сакавіка 1941 года тут пачалі будавацца дзоты. Перад пачаткам вайны інспектаваў будаўніцтва гэтых умацаванняў недалёка ад Гродна Дз. Карбышаў.

Шматбаковым і цікавым у 1941 годзе было культурнее жыццё ў горадзе над Нёманам. На сцэне гродзенскага тэатра выступалі Маскоўскі мастацкі акадэмічны тэатр імя У. Неміровіча-Данчанкі, лялечны тэатр пад кіраўніцтвам С. Абразцова. Адбыліся канцэрты хору імя М. Пятніцкага, джаза Л. Уцёсава, ансамбляў Чырвонаармейскай песні і танца, церскіх казакоў, выступленні І. Ільінскага. Працавалі музей, 5 клубаў, 25 бібліятэк, 23 чырвоныя вугалкі, дзіцячая музычная школа і 3 кінатэатры. У калектывах развівалася мастацкая самадзейнасць. Часта выступалі перад гараджанамі хор і аркестр народных інструментаў.

У суботу 21 чэрвеня 1941 года, у горадзе адчуваўся передвыхадны настрой, нягледзячы на чуткі аб вайне. Вуліцы і паркі былі запоўнены моладзю, выпускнікамі школ. У кінатэатрах горада ў той вечар дэманстраваліся кінафільмы «Хлапец з нашага горада», «Салават Юлаеў», «Таямнічы востраў», у драматычным тэатры ішла прэм’ера спектакля па п’есе А. Афінагенава «Машачка». У гэты час на гастролях у Гродна быў Бранскі драматычны тэатр імя У.У. Маякоўскага.

Ноч над горадам была па-летняму цёплай ціхай. А на досвітку 22 чэрвеня 1941 года на старажытны мірны Гродна наляцелі нямецкія бамбардзіроўшчыкі. Пачалася Вялікая Айчынная вайна, у якой загінулі 33 тысячы жыхароў нашага горада.

Гродзенцы ніколі не забудуць тых, хто аддаў сваё жыццё ў суровым 1941 годзе, змагаўся ў гады вайны з акупацыйным фашысцкім рэжымам, вызваляў горад у 1944 годзе і адбудоўваў яго ў пасляваенныя часы.